Вучоныя запіскі 2019 • Вып. 15
Ч. 1. • Гуманітарныя і грамадскія навукі

УДК 124.42-053.2:821.111-1.09“17/18”

***І. В. Поўх***
*канд. філал. навук, дац. каф. замежных моў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
e-mail: iryna_powkh@tut.by

# АРХЕТЫП ДЗІЦЯЦІ Ў ТВОРЧАСЦІ АНГЛІЙСКІХ ПАЭТАЎ ЭПОХІ РАМАНТЫЗМУ

*Разглядаецца праблема ўвасаблення архетыпу дзіцяці ў творчасці англійскіх паэтаў-рамантыкаў У. Блэйка і У. Уордсварта. Аўтар вылучае асноўныя ўласцівасці адзначанага архетыпу і спосабы адлюстравання сімволікі дзяцінства ў паэзіі эпохі Рамантызму. Асаблівая ўвага надаецца ўзаемасувязі дзяцінства і прыроды, канцэптам нявіннасці і натуральнасці ў асобе чалавека, прыроднай мудрасці і гармоніі дзяцінства. Прыведзены літаратуразнаўчы аналіз асобных твораў з пункту погляду ўвасаблення ў іх архетыпу дзіцяці на ўзроўні вобразнай сферы, лексічных і сінтаксічных сродкаў мастацкай выразнасці.*

## Уводзіны

У сучасным літаратуразнаўстве існуе шэраг даследаванняў, прысвечаных архетыпу дзіцяці ў літаратуры. Да яго звярталіся Л. М. Осцін, К. Рэйнальдс, Дж. Плотц, Э. Хопкінс і іншыя навукоўцы [1; 2]. Усе яны падкрэсліваюць значную ролю эпохі Рамантызму ў працэсе стварэння і распрацоўкі архетыпу дзіцяці ў розных відах мастацтва, у прыватнасці літаратуры.

Традыцыйнае пурытанскае стаўленне да дзіцяці як істоты, што ад нараджэння носіць на сабе першародны грэх падзення чалавецтва, і дзяцінства як перыяду, поўнага рызыкі і небяспекі, страчвае сваю актуальнасць з сярэдзіны XVIII ст. Пурытанская літаратура была накіравана на вyратаванне дзіцячых душ праз навучанне і прыклад правільных паводзін. У сваю чаргу, з сярэдзіны XVIII ст. з перыядам дзяцінства пачалі асацыіравацца больш станоўчыя якасці і ўласцівасці: нявіннасць, свабода, творчасць, шчырасць, непасрэднасць і, магчыма, найважнейшае для тых, хто займаўся адукацыяй і выхаваннем дзяцей, – здольнасць прыстасоўвацца да знешніх абставін. Ж.-Ж. Русо, адзін з натхняльнікаў Французскай рэвалюцыі, сцвярджаў, што прыродзе дзяцінства ўласціва адкрытасць, якой іх пазбаўляе грамадства. Менавіта Ж.-Ж. Русо належыць канцэпцыя «дзіця прыроды» і сцвярджэнне, што дзецям патрэбна як мага меней фармальнай адукацыі – ім неабходна жыць на прыродзе, ад якой яны самі возьмуць усё, што трэба.

Ідэя «дзіцяці прыроды» мела значны ўплыў на творчасць паэтаў-рамантыкаў, якія разглядалі дзяцінства як самастойны, непаўторны перыяд у жыцці чалавека, які мае ўласную каштоўнасць і які нельга скарачаць штучным паспешным сталеннем.

Літаратуразнаўца Д. Г. Джыльям прапаноўвае наступную інтэрпрэтацыю паняцця «нявіннасць»: «“Нявіннасць” – гэта паняцце, якое мы ўжываем у дачыненні да жывёл, дзяцей і дарослых, што жывуць проста і немудрагеліста» [3, с.14]. З прыведзенага азначэння вынікае, што дарослыя таксама могуць быць нявіннымі. Д. Г. Джыльям канкрэтызуе сваю думку наступным чынам: «У дзяцей ёсць прыродная прыязнасць, якую яны дэманструюць натуральна, але якую рэдка можна заўважыць у вопытных дарослых, апрача тых, хто здолеў захаваць прыродную ласкавасць. Моманты нявіннасці больш каштоўныя ў дарослых: яны ўраўнаважваюць больш складаную істоту і глыбокія веды, чым у дзяцей» [3, с. 14].

Паэты-рамантыкі адхіляюць некаторыя думкі і перакананні сваіх папярэднікаў як занадта строгія і рыгідныя для дзяцей. Яны сцвярджаюць, што жорсткая дысцыпліна

не дазваляе дзецям адкрыта праяўляць свае думкі і пачуцці, у першую чаргу адмоўныя. Паэты-рамантыкі надаюць перавагу асобе перад грамадствам, эмацыянальнаму пачатку перад рацыянальным, натуральнаму перад штучным. Дзіцячая непасрэднасць бачыцца паэтам-рамантыкам як асаблівы стан мыслення, калі эмоцыі і ўражанні пераважаюць над розумам і логікай. У пошуках натхнення яны звяртаюцца да фальклору, прыроды і мінулага, распрацоўваюць філасофію дзяцінства як перыяду адкрытасці і шчырасці, цеснай і непарыўнай сувязі з Богам і прыродай, перыяду, калі чалавека трэба ахоўваць ад жорсткіх рэалій жыцця, паважаць і берагчы яго ўнутраную чысціню.

Мэта даследавання – прасачыць шляхі ўвасаблення архетыпу дзіцяці ў паэзіі эпохі Рамантызму на прыкладзе творчасці У. Блэйка і У. Вордсварта.

**Архетып дзіцяці ў творчасці У. Блэйка**

Уяўленне пра дзяцінства як перыяд нявіннасці, шчырасці і адкрытасці знайшло сваё адлюстраванне ў творчасці У. Блэйка, П. Б. Шэлі, С. Т. Кольрыджа, У. Уордсварта і іншых паэтаў эпохі Рамантызму, а таксама мела ўплыў на пазнейшыя адукацыйныя тэорыі і спосабы ўвасаблення вобраза дзіцяці ў творчасці паэтаў і пісьменнікаў наступных пакаленняў. Сімволіка дзяцінства прыцягвала рамантыкаў сваёй натуральнасцю, нявіннасцю, чысцінёй, непасрэднасцю, шчырасцю, наіўнасцю, мудрасцю і блізкасцю да Бога. Дзяцінства пазіцыянавалася як найлепшы перыяд у жыцці чалавека, увасабленне надзей і спадзяванняў усяго чалавецтва, у той час як сталенне азначала адыход ад гэтага благаславеннага стану. Стаўленне да дзяцінства як найбольш натуральнага перыяду ў жыцці чалавека абумовіла вядучую ролю топасу прыроды як неад’емнай часткі архетыпу дзіцяці ў творчасці згаданых вышэй паэтаў. Дзеці ў вершах паказваюцца на свежым паветры, часта побач са звярамі і птушкамі, дзе яны не толькі гуляюць, але і набываюць новыя веды пра навакольнае асяроддзе. Топасы прыроды і вёскі ў паэзіі эпохі Рамантызму ствараюць своеасаблівую сімвалічную прастору, найбольш спрыяльную для развіцця прыродных схільнасцей і здольнасцей дзяцей.

Зборнік «Песні нявіннасці» У. Блэйка (упершыню выдадзены ў 1789 г.) – прадвеснік рамантычнай чуллівасці і сентыментальнасці, у якім найбольш выразна і пераканаўча гучыць пастаральная ідэя адзінства дзіцяці і прыроды. У. Блэйк увасабляе супрацьпастаўленне рамантычнай прыхільнасці да ўсяго прыроднага, натуральнага і мадэрнізму, з яго індустрыяльна-ўрбаністычнымі матывамі ў зборніках «Песні нявіннасці» і «Песні вопыту» (упершыню выдадзены ў 1795 г.). Так, у вершы «Лондан» паэт стварае вобраз гарадскога дзіцяці, разгубленага, няшчаснага, спалоханага. Агульны настрой верша падкрэсліваецца шэрагам адмоўна афарбаваных лексічных адзінак: *manacles* – наручнікі, *wandered* – блукаў, *weakness* – бяссілле, *woe* – жалоба, *fear* – страх і інш.

I wandered thro’ each charter’d street,
Near where the charter’d Thames does flow,
And mark in every face I meet
Marks of weakness, marks of woe.
In every cry of every Man,
In every Infant’s cry of fear,
In every voice, in every ban,
The mind-forg’d manacles I hear.
How the Chimney-sweeper’s cry
Every black’ning Church appals [4, с. 40].

Вобраз дзіцяці прысутнічае і ў вершах сацыяльнай праблематыкі. Напрыклад, у «Маленькім чорным хлопчыку» У. Блэйк падкрэслівае духоўную аднолькавасць дзяцей з цёмнай і светлай скурай, тым самым выступаючы ў падтрымку руху супраць расізму і гандлю рабамі. Антытэза чорны – белы з першых радкоў падкрэслівае агульны настрой твора. Як і ў разгледжаным вышэй вершы, аповед вядзецца ад першай асобы, што дазваляе чытачу ўбачыць свет вачыма дзіцяці:

My mother bore me in the southern wild
And I am black, but O! My soul is white [4, c. 5].

Дзіцячую нявіннасць і шчырасць, душэўную чысціню і давер перадае наіўная ўпэўненасць у тым, што цёмны колер скуры – толькі хмарка, якая з цягам часу знікне:

And these black bodies and this sun burnt face
is but a cloud, and like a shady grove [4, c. 5].

Верш мае агульную мінорную танальнасць, абумоўленую знявагай і пагардай, якую дзіця адчувае да сябе з боку людзей з іншым колерам скуры. Тым не менш гэты смутак светлы, што падкрэсліваецца і сістэмай параўнанняў (светласкурае дзіця – анёл, душы дзяцей – ягняты), і створанай у вершы сімвалічнай прасторай, дзе адбываецца дзеянне (дзіця сядзіць пад дрэвам на матчыных каленях), і метафарычнымі вобразамі-сімваламі (сонечнае святло, радасць, раніца, усход і інш.).

Матыў страты дарослага гучыць у вершы «Маленькі хлопчык заблукаў» (зборнік «Песні нявіннасці»). Верш складаецца з дзвюх строф, першая з якіх гучыць ад першай асобы, маленькага хлопчыка, другая – ад трэцяй, дарослага апавядальніка, што назірае за сітуацыяй. Дынамічнасць і эмацыянальная афарбаванасць першай страфы перадае адчай спалоханага дзіцяці пераважна сінтаксічнымі сродкамі: кароткія радкі, звароты, паўторы, пабуджальныя канструкцыі:

Father, father, where are you going
O do not walk so fast.
Speak father, speak to your little boy
Or else I shall be lost [4, c. 8].

Другая страфа гучыць значна больш павольна і стрымана, адлюстроўваючы халодную, змрочную атмасферу ночы і дзіцячую адзіноту ў ёй. Манатоннасць і аднастайнасць рытмічнай структуры гэтай страфы перадаецца праз сінтаксічны паралелізм трох першых радкоў:

The night was dark no father was there
The child was wet with dew.
The mire was deep, & the child did weep
And away the vapour flew [4, c. 8].

Варта адзначыць, што, нягледзячы на агульную сітуацыю страты, твор мае аптымістычную канцоўку: злыя духі знікаюць у начной цемры і не палохаюць дзіця.

Лагічным працягам верша «Маленькі хлопчык заблукаў» выступае верш «Маленькі хлопчык знайшоўся» з гэтага ж зборніка. Вершы аб’ядноўвае матыў слёз дзіцяці, але ў другім вершы перад хлопчыкам з’яўляецца Бог і вядзе яго да маці, тым самым сцвярджаючы ідэю дзяцінства як благаслаўлёнага часу, калі чалавек знаходзіцца пад асабліва моцнай аховай Бога і анёлаў.

Сфера настрояў і пачуццяў дзіцяці таксама знайшла сваё ўвасабленне ў творчасці У. Блэйка. Так, антаганістычныя па сваім настроі вершы «Смутак немаўляці» і «Радасць немаўляці» са зборнікаў «Песні вопыту» і «Песні нявіннасці» адпаведна ствараюць два супрацьлеглыя вобразы нованароджанага дзіцяці. Першае нарадзілася, відавочна, у беднай сям'і, не патрэбнае нікому, што перадаецца эмацыянальна афарбаванымі дзеясловамі і прыметнікамі з адмоўнай канатацыяй:

My mother groaned! My father wept
Into the dangerous world I leapt:
Helpless. Naked. Piping loud [4, c. 42].

Другі верш пабудаваны ў форме дыялогу з няўласна простай мовай паміж маці і немаўляткам. У апошняга яшчэ няма імя, але яно, відавочна, доўгачаканае, нясе радасць у сям'ю:

I have no name
I am but two days old. –
What shall I call thee?
I happy am
Joy is my name, –
Sweet joy befall thee! [4, c. 18].

Агульны прыўзняты настрой верша ствараецца як лексічнымі, так і сінтаксічнымі сродкамі. Кароткія радкі робяць твор дынамічным і простым, перадаюць рухавасць і чысціню думак малога дзіцяці. Шматлікія паўторы, клічныя сказы, у тым ліку напрыканцы кожнай з дзвюх строф адсылаюць чытача да магіі дзіцячага фальклору – замоў, пацешак, забаўлянак, тым самым падкрэсліваючы нявіннасць дзяцінства і яго блізкасць да прыроды.

**Архетып дзіцяці ў творчасці У. Уордсварта**

Архетып дзіцяці займае значнае месца ў творчасці англійскага паэта-рамантыка У. Уордсварта. Вобраз дзіцяці ў яго паэзіі ідэалізаваны: дзеці ўяўляюцца паэту больш дасканалымі і вартымі павагі і шанавання, чым дарослыя. Так, у вершы «Вясёлка» перыфраза «бацька чалавека» ў дачыненні да дзіцяці сцвярджае прыродную мудрасць і пабожнасць дзяцінства, што з узростам страчваюцца пад уздзеяннем знешніх абставін. «Ода Несмяротнасці» («Ода: Пачуццё несмяротнасці з ранняга дзяцінства») стварае архетып дзіцяці праз шэраг вобразаў, што падкрэсліваюць яго чысціню і натуральную гармонію – прырода, «святло нябёсаў», вясёлка, ружа, птушкі і ягняты, сонца, Бог, маці. Само дзіця атрымлівае шэраг метафарычных найменняў, якія падкрэсліваюць яго веліч – *Mighty Prophet* (Магутны прарок), *Eye among the blind* (Вока між сляпых), *Philosopher* (Філосаф), *Nature's Priest* (Святар прыроды), *Master o'er a Slave* (Гаспадар над рабом), *Presence which is not to be put by* (Прысутнасць, якой не пазбегнуць) і інш.

Сваёй творчасцю У. Уордсварт прапагандуе навучанне ў натуральным асяроддзі і выхаванне праз сапраўдныя жыццёвыя сітуацыі, засваенне маральных каштоўнасцей праз паводзіны блізкіх і знаёмых яму людзей, разуменне неабходнасці быць добрым, спагадлівым, чулым, смелым і г. д. на ўласным вопыце. Паэт сцвярджае, што менавіта прырода павінна быць першым настаўнікам дзіцяці. Маніфестам яго светапогляду гучыць верш «Сталы перакулены». Аўтар заклікае дзіця кінуць кнігі і выйсці ў поле, да сонца, паслухаць спеў птушак і засвойваць веды не розумам, а сэрцам.

And hark! how blithe the throstle sings!
And he is no mean preacher;
Come forth into the light of things,
Let Nature be your teacher [5].

Верш пабудаваны на супрацьпастаўленні двух семантычных палёў: класічнага і натуральнага навучання. Семантычнае поле класічнага навучання ствараюць пераважна лексічныя адзінкі з адмоўнай канатацыяй: *toil and trouble* – праца і клопат, *dull and endless strife* – нудная і бясконцая барацьба, *mean preacher* – суровы прапаведнік, *barren leaves* – пустыя аркушы і інш. У сваю чаргу, семантыка натуральнага навучання складаецца з кантэкстуальных антонімаў прыведзеных вышэй лексічных адзінак: *freshening lustre mellow* – свежы, сакавіты бляск, *sweet music* – прыемная музыка, *spontaneous wisdom* – раптоўная мудрасць і інш.

У шэрагу вершаў У. Уордсварта гучыць ідэя кароткачасовасці дзяцінства, яго безабароннасці перад жорсткім і няўмольным матэрыяльным светам дарослых. Вершы гэтай тэматычнай групы прасякнуты глыбокім смуткам, пакутніцтвам, тугой, пачуццём страты і блізкасцю смерці, якія ахутваюць вобраз дзіцяці (вершы «Вечаровае блуканне», «Віна і шкадаванне», «Вершы Люсі» і інш.). Так, у вершы «Вечаровае блуканне» паэт распавядае пра бяздомную жанчыну, якая блукае са сваімі дзецьмі і нідзе не знаходзіць прытулку. Тым не менш яна імкнецца супакоіць і развесяліць дзяцей, прапануючы ім то паглядзець на зорку, што падае з неба, то пагуляць з жуком-светляком:

Turn to a silent smile their sleepy cry,
By pointing to the gliding moon on high.
When low hung clouds each star of summer hide,
Oft has she taught them on her lap to lay
The shining glow-worm [6].

Трагічны кантраст паміж безнадзейнасцю аб’ектыўнай сітуацыі і імкненнем знайсці ў ёй нешта станоўчае перадаецца праз шэраг супастаўленняў: усмешка і плач, цяжкія хмары, за якімі хаваюцца зоркі і поўня і г. д. У выніку змрок і цемра перамагаюць, намаганняў маці недастаткова, каб захінуць дзяцей ад пранізлівага ветру, дажджу і навальніцы, сагрэць іх сваім дыханнем.

Oh! when the sleepy showers her path assail,
And like a torrent rears the headstrong gale;
No more her breath thaw their figures cold,
Their frozen arms her neck no more can fold [6].

Дзеці замярзаюць і гінуць – на думку паэта, гэта адзінае выйсце з бясконцага шэрагу цяжкасцей і перашкод.

**Заключэнне**

Такім чынам, архетып дзіцяці – адзін з найбольш значных у паэзіі эпохі Рамантызму – атрымлівае разнастайную інтэрпрэтацыю ў творчасці паэтаў-рамантыкаў. Паслядоўнікі Ж.-Ж. Русо разглядалі дзяцінства як перыяд максімальнай адкрытасці і шчырасці, адзінства з прыродай, здольны змяніць свет і грамадства да лепшага. Дзяцінства ўспрымалася як увасабленне нявіннасці, блізкасці да Бога і прыроднай мудрасці. Увасабленне архетыпу дзіцяці ў творчасці У. Блэйка і У. Уордсварта адбываецца праз сістэму скразных вобразаў як са станоўчай, так і з адмоўнай канатацыяй,

лексічных і сінтаксічных сродкаў выразнасці. У. Блэйк падкрэслівае чысціню і нявіннасць дзіцяці, яго бездапаможнасць перад знешнімі абставінамі. Такая інтэрпрэтацыя архетыпа дзіцяці назіраецца і ў асобных вершах У. Уордсварта, але ў той жа час паэт ставіць дзіця вышэй за дарослага, дзякуючы яго натуральнай гармоніі і чысціні, пабожнасці і прыроднай дасканаласці.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Metz, S. Romanticism and the Child: Inventing Innocence [Electronic resource] / S. Metz // Romantic Poets. – Mode of access: http://web.utk.edu/~gerard/romantic-politics/-childhood.html. – Date of access: 20.09.2019.
2. Reynolds, K. Perceptions of childhood [Electronic resource] / K. Reynolds // Discovering Literature: Romantics & Victorians. – Mode of access: https://www.bl.uk/romantics-and-victorians/articles/perceptions-of-childhood. – Date of access: 25.09.2019.
3. Gillham, D. G. William Blake / D. G. Gilliam. – London : Cambridge Univ. press, 1973. – 216 p.
4. Blake, W. Songs of Innocence and of Experience [Electronic resource] / W. Blake // Global Language Resources. – Mode of access: http://triggs.djvu.org/djvu-editions.com/-BLAKE/SONGS/Download.pdf. – Date of access: 05.10.2019.
5. Wordsworth, W. The Tables Turned [Electronic resource] / W. Wordsworth // Poetry Foundation. – Mode of access: https://www.poetryfoundation.org/poems/45557/the-tables-turned. – Date of access: 23.09.2019.
6. Wordsworth, W. The Earliest Wordsworth: Poems, 1785–1790 / W. Wordsworth. – New York : Routledge, 2002. – 140 p.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 21.10.2019

***Powkh I. V.* The Child Archetype in English Romantic Poetry**

*The article discusses the child archetype manifestation in the poetry of English Romanticists W. Blake and W. Wordsworth. The author points out the main features of the said archetype and analyses the most common childhood symbols in Romantic poetry. Special attention is paid to the close ties between childhood and nature, the concepts of personal innocence and natural behaviours, the inborn wisdom and harmony of childhood. The conclusions are based on literary analysis of individual poems in terms of imagery, lexical and syntactical stylistic devices.*